Пасля Рыжскай мірнай дамовы і падзелу Беларусі Раман Скірмунт застаўся ў сваім маёнтку. У 1923—1928 гг. ён працаваў суддзёй Пінскага акружнога суда, быўсенатарам Польшчы (1930—1935 гг.). У верасні 1939 г. Раман Аляксандравіч у чарговы раз выказаў свае адносіны да роднай зямлі. Ён не пакінуў Беларуь. На вялікі жаль Раман Скірмунт разам з мужам сястры 7 кастрычніка 1939 г.быў забіты.

На наш погляд, такія імёны патрыётаў беларускай зямлі павінны заняць сваё пачэснае месца ў жыцці сучаснага пакалення.

### Бібліяграфічны спіс

1. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917—1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. — Мінск: БДУ, 2003. — 307 с.
2. Гигин, В. Могла ли состояться БССР в 1917 году? // Беларуская думка. —2009. — № 12. — С. 62—71.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. — Ф. 60. — Воп. 3. — Спр. 242.
4. Турук, Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. — М.: Гос. изд-во, 1921. — 151 с.
5. Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця ў Менску ў 1917—1918 гг. // Спадчына. — 1997. — № 5. — С. 18—39.

**Мірановіч Яўген**

*Універсітэт у Беластоку (Беласток, Польшча)*

## ПРАБЛЕМА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ НА МІРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ Ў ПАРЫЖЫ

Пераможцы ў Першай сусветнай вайне вызначалі новы міравы парадак на Парыжскай канферэнцыі, якая пачала працу ў студзені 1919 г. У выніку ваенных падзей у Еўропе распаліся тры вялікія імперыі. Народы, якія пражывалі ў іх межах, заявілі аб жаданні стварыць нацыянальныя дзяржавы. Гэты працэс закрануў і беларусаў. 25 сакавіка 1918 г. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) абвясціла незалежнасць, што было праявай волі нацыянальных эліт. На практыцы аднак дасягнуць незалежнасці і атрымаць міжнароднае прызнанне было вельмі складана.

Напрыканцы 1918 г. лідэрам новых дзяржаў Усходняй і Сярэдняй Еўропы стала вядома, што палітычную карту кантынента акрэсляць пераможцы ў Першай сусветнай вайне на мірнай канферэнцыі ў Парыжы. У Расіі ў гэты час ішла грамадзянская вайна. Былыя саюзнікі Імперыі Раманавых — Францыя, Велікабрытанія — чакалі перамогі антыбальшавіцкай апазіцыі, а таму ў пытанні пасляваеннага палітычнага парадку ва Усходняй Еўропе сур'ёзна разглядалі пункт гледжання цэнтраў улады, якія сфарміраваліся вакол генерала М. Дзянікіна і адмірала А. Калчака. Ніводны з іх не прызнаваў магчымасці існавання беларускай дзяржаўнасці. Бальшавіцкую ўладу лідэры Антанты лічылі часовай, а таму не запрашалі ўрад савецкай Расіі на Парыжскую канферэнцыю.

Найважнейшыя палітычныя ігракі — французы і англічане — рэалізуючы свае праекты палітычнага парадку ў Еўропе не прадугледжвалі існаванне бела-

рускай дзяржавы. Справа міжнароднага прызнання БНР з самага пачатку не мела шанцаў на паспяховае завяршэнне. Аднак Рада БНР вырашыла пасляць у сталіцу Францыі сваю дэлегацыю, каб адстойваць там інтарэсы Беларусі. Узначаліў яе прэм'ер-міністр Савета народных міністраў — А. Луцкевіч. Трэба зазначыць, што ўрад БНР ніколі не кантраляваў тэрыторыю, якую беларускія дзеячы хацелі бачыць у складзе Народнай Рэспублікі. Больш таго, калі Луцкевіч прыехаў у Парыж, гэта тэрыторыя была поўнасцю кантралявалася з аднога боку бальшавікамі, з другога — палякамі.

22 студзеня 1919 г. Луцкевіч падпісаў у Гродне «Мемарыял беларускага ўраду да старшыні мірнай канферэнцыі» [1, дак. 1170]. Урад БНР звяртаўся да ўдзельнікаў канферэнцыі з просьбай дапамагчы ў пабудове беларускай дзяржавы і даць магчымасць дэлегатам Рады БНР непасрэдна прадставіць свае патрабаванні. Аўтары пры гэтым звярталі ўвагу на тое, што не трэба ўспрымаць беларускую праблему як унутрырасійскую. Яны спрабавалі пераканаць асноўных міравых лідэраў у факце існавання беларускага народа, які гатовы браць адказнасць за свой лёс. Пры гэтым у дакуменце не было ніякіх аргументаў, якія б дапамаглі заручыцца даверам да ўрада БНР, яго магчымасці абараніць тэрыторыю і арганізаваць на ёй эканамічнае і палітычнае жыццё.

Акрамя таго аўтары дакументаў, што адсылаліся ў Парыж, зрабілі памылку у выкарыстанні назвы сваёй дзяржавы. Змест назвы «Беларусь» яны пісалі па-ангельску «White Russia», а па-французску «Russie-Blanche». На Захадзе, дзе пра Беларусь мала хто што-небудзь ведаў, прачыталі гэта як Белая Расія, а мемарыял — як дакумент ад нейкага расійскага антыбальшавіцкага цэнтра.

Урад БНР не меў у сваім распараджэнні ніякага бюджэта. Яго прадстаўнікі ехалі ў Парыж і нават не мелі сродкаў на пражыванне ў сталіцы Францыі. Луцкевіч быў вымушаны затрымацца ў Берліне, каб у мясцовым банку забраць грошы пазычаныя ўрадам Украінскай Народнай Рэспублікі (УНР) на дыпламатычную дзейнасць БНР. У Берліне беларускія палітыкі таксама шукалі падтрымку з боку немцаў [1, дак. 1353, 1359]. Намаганні гэтыя былі зусім неабгрунтаваныя. Немцы пасля капітуляцыі ў лістападзе 1918 г. нічым не маглі дапамагчы Беларусі. На Парыжскай канферэнцыі яны самі былі не суб'ектам, а прадметам палітыкі.

Па просьбе бальшавікоў Берлінскі банк заблакаваў рахунак, на якім былі ўкраінскія грошы для ўраду БНР, а таму фінансавай магчымасці для паездкі ў Парыж не было. У гэтай сітуацыі аднаго з членаў дэлегацыіі — А. Цвікевіча — накіравалі ў Кіеў, каб пераканаць украінцаў перавесці грошы ў Венскі банк [1, дак.1316]. Аддзяленне гэтага банка знаходзілася ў Празе. Луцкевіч падаўся ў сталіцу нядаўна ўзнікшай Чэхаславакіі. Пры нагодзе ён правёў размову з паслом Украіны О. Славінскім на прадмет узаемнай падтрымкі ў Парыжы, бо УНР мела падобныя праблемы з міжнародным прызнаннем.

Чакаючы ўкраінскія грошы, 17 красавіка 1919 г. Луцкевіч нанёс візіт прэзідэнту Чэхаславакіі Т. Масарыку. Апошні заявіў аб падтрымцы патрабавання аб прызнанні беларускай дзяржаўнасці і паабяцаў даць інструкцыі міністру замежных спраў Э. Бенешу дзейнічаць на Парыжскай канферэнцыі на карысць Беларусі. Масарык адаслаў, аднак, Луцкевіча ўзгадніць справы адносна беларуска-чэхаславацкіх адносін да прэм'ер-міністра К. Крамаржа, які быў ярым прыхільнікам цэласнасці Расіі і не прызнаваў існавання не толькі

Беларусі, але і Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі [2, s. 437]. Такім чынам, Масарык проста правёў з Луцкевічам адну са шматлікіх неафіцыйных сустрэч, якая нічога не вызначала ў лёсе Беларусі.

Перад беларускай дэлегацыяй, у складзе якой былі генерал К. Кандратовіч і палкоўнік Я. Ладноў, стаяла мэта: прадставіць старшыні канферэнцыі, французскаму прэмьер-міністру Ж. Клемансо мемарыял у справе незалежнасці і непадзельнасці тэрыторыі Беларусі. Аднак, вясной 1919 г. тэрыторыю, якую лідэры БНР бачылі ў межах рэспублікі, ад захаду занімалі палякі, а на ўсходзе правілі бальшавікі. Менавіта таму беларускія палітыкі імкнуліся зрабіць акцэнт на непадзельнасці рэспублікі. Яны разглядалі Польшчу як агрэсара, які пад прыкрыццём змагання з бальшавікамі ствараў структуры акупацыйнай улады на Беларусі.

У ролі саюзнікаў Беларусі на Парыжскай мірнай канферэнцыі дэлегацыя БНР спадзявалася пабачыць Украіну, Чэхаславакію, Фінляндыю, Літву, Латвію, Эстонію, Грузію, Арменію і Азербайджан [1, дак. 1778]. Гэтыя краіны аб’ядноўвала супольная мэта — дасягнуць міжнароднага прызнання ва ўмовах пратэсту з боку прысутных на канферэнцыі прадстаўнікоў антыбальшавіцкай Расіі.

Пакуль беларусы даехалі да Парыжа, удзельнікі канферэнцыі прынялі мемарыялы ад палякаў і літоўцаў, выслухалі таксама дэлегатаў гэтых краін. Палякі заявілі пра планы стварэння федэратыўнай дзяржавы, у якой было месца для нейкай беларускай аўтаноміі. Гэта адбылося летам 1919 г., калі Польшча кантралявала заходнюю і цэнтральную Беларусь. Урад БНР не меў у сваім распараджэнні арміі, не кантраляваў ніякай тэрыторыі, таму пра беларускую аўтаномію палякі згадвалі толькі каб пераканаць галоўных удзельнікаў канферэнцыі ў сваёй канцэпцыі тэрытарыяльнага падзелу Усходняй Еўропы.

Фактычна антыбеларускую палітыку вяла ў Парыжы і дэлегацыя літоўскага ўрада. Літоўцы прывязлі з сабой дакумент ад Беларускай управы Гродзенскага краю, дзе гаварылася, што мясцовыя беларусы жадаюць быць грамадзянамі Літвы. Яны таксама уключылі ў склад сваёй дэлегацыі члена Тарыбы беларуса Д. Сямашку, які выступіў з мемарыялам ад імя віленскіх беларусаў за далучэнне Віленшчыны да Літвы [1, дак. 1220]. У кулуарах канферэнцыі літоўцы вялі прапаганду па змесце падобную да польскай і пераконвалі палітыкаў у тым, што не існуе ніякага беларускага народа, а ёсць толькі нейкія неакрэсленыя людзі, якім не пад сілу свая дзяржава.

У канцы чэрвеня 1919 г. літоўцы адкрыта ўжо гаварылі пра план інкарпарацыі Гродзеншчыны і Віленшчыны, а беларусам прапаноўвалі палітычную падтрымку для ідэі дзяржавы, якая магла б быць на ўсход ад лініі Пінск–Навагрудак–Дзвінск [1, дак. 1270, 1278].

Для французаў і англічан рашаючым у большасці пытанняў быў голас антыбальшавіцкай Расіі, урад якой знаходзіўся ў Омску. А за Уралам улада неўзабаве апынулася ў руках адмірала Калчака. Дэлегаты з Омска не прызнавалі самастойнасці ні Беларусі, ні Украіны, ні іншых рэспублік, якія паўсталі ў межах былой Імперыі Раманавых. З Калчаком былі звязаны надзеі лідэраў Антанты на паспяховае, з іх пункту гледжання, завяршэнне ўнутранага канфлікту ў Расіі. З гэтай прычыны голас антыбальшавіцкай апазіцыі меў вялікі ўплыў на французаў і англічан, якія прымалі лёсавызначальныя для народаў Усходняй Еўропы рашэнні.

Выклікам для рускіх была, прапагандысцкая ў сапраўднасці, аб’яўленая прэм’ер-міністрам Польшчы І. Падэрэўскім канцэпцыя федэратыўнай дзяржавы. На яе вельмі хутка адрэагаваў прадстаўнік Калчака С. Сазонаў, які прапанаваў усім народам палітычную аўтаномію ў шматнацыянальнай Расіі. У ліку тых, каму адрасаваў свае пасланне Сазонаў, былі і беларусы [1, дак. 1228].

Пазней былі прадстаўлены яшчэ дзве падобнага роду прапановы. Пасля размоваў з Б. Савінкавым і В. Маклакавым Луцкевіч прыйшоў да высновы, што «белыя» ў сапраўднасці абмежаваліся лозунгамі пра аўтаномію, але рэальна нічога не прапануюць.

25 чэрвеня 1919 г. Луцкевіч прапанаваў Падэрэўскаму правесці размову на тэму федэратыўнай польска-беларускай дзяржавы. 1 ліпеня ён адправіў прэм’ер-міністру Польшчы праект арганізацыі дзвюх раўнапраўных дзяржаў з мытным саюзам і органам для каардынацыі замежнай палітыкі [3, s. 74—77]. Невядома як успрыняў прапановы Луцкевіча Падэрэўскі, але не ён вызначаў знешнюю палітыку Польшчы.

8 жніўня 1919 г. армія Ю. Пілсудскага заняла Мінск. Луцкевіч вырашыў пакінуць Парыж, каб рэалізаваць праект федэрацыі з начальнікам Польшчы Пілсудскім. Члены беларускай дэлегацыі з Ладновым засталіся ў Парыжы і спрабавалі пераканаць саюзнікаў у неабходнасці існавання беларускай дзяржавы для еўрапейскага парадку. Аднак, яны не знаходзілі слухачоў сярод тых, хто вырашаў лёс еўрапейскіх народаў.

Луцкевіч крытычна ацэньваў польскую палітыку на акупаванай тэрыторыі БНР [4, s. 10—19], тым не менш ён быў прыхільнікам пошуку паразумення з палякамі [5, s. 450—453]. У сваю чаргу большасць членаў Рады не бачыла ніякіх перспектыў карыснага для Беларусі кампрамісу з Польшчай.

Праблема беларуска-польскіх адносін падзяліла урад і Раду БНР. Восенню 1919 г. ужо было две Рады і два ўрада. Другі, які знаходзіўся ў Коўне, узначальваў В. Ластоўскі. У снежні ў Парыж прыбыла дэлегацыя з Коўна, што яшчэ больш пераконвала галоўных удзельнікаў канферэнцыі ў несур’ёзнасці беларускай праблемы [1, дак. 1849, 1896, 1897].

На Парыжскай канферэнцыі Беларусь не мела ніякіх рэальных саюзнікаў. Ні Францыя, ні Вялікабрытанія, якія змагаліся за свае праекты еўрапейскага парадку, не бачылі палітычнага інтарэсу ў існаванні беларускай дзяржавы. Пасля перамогі бальшавікоў у Расіі гэтыя дзяржавы рэалізоўвалі палітыку падтрымкі Польшчы як буфера супраць экспарту рэвалюцыі ў Еўропу. На практыцы гэта спрыяла замацаванню падзела Беларусі і Украіны паміж Польшчай і Савецкай Расіяй.

Падчас Парыжскай мірнай канферэнцыі ўсе суседзі імкнуліся далучыць да сябе кавалкі беларускай зямлі. Толькі ўрады Украіны і Латвіі па розных прычынах і з улікам сваіх інтарэсаў праяўлялі зацікаўленасць у існаванні беларускай дзяржавы. Іх палітычны патэнцыял не меў аднак ніякага значэння для станоўчага вырашэння на міжнародным узроўні якіх-небудзь праблем дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі.

### Бібліяграфічны спіс

1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: у 2 т. / укл. С. Шупа. — Вільня-Нью Ёрк-Менск-Прага: Бел. Ін-т навукі і мастацтва: Т-ва бел. Пісьменства «Наша Ніва», 1998. — т. 1, кн. 1. — 850 с.

2. Michaluk, D. Białoruska Republika Ludowa 1918—1920. U podstaw białoruskiej państwowości / D. Michaluk. — Toruń: Wyd-wo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2010. — 597 s.
3. Gomółka, K. Między Polską a Rosją. Białoruś w koncepcjach ugrupowań politycznych 1918—1922 / K. Gomółka. — Warszawa: Gryf, 1994. — 263 s.
4. Луцкевіч, А. Польская окупацыя ў Беларусі / А. Луцкевіч. — Вільня, 1920. — 20 с.
5. Łatyszonek, O. Rozmowy Józefa Piłsudskiego z Antonim Łuckiewiczem. Przyczynek do dziejów stosunków polsko-białoruskich / O. Łatyszonek // Europa Orientalis. Polska i jej wschodni sąsiedzi od średniowiecza po współczesność. — Toruń 1996. — S. 447—453.